# РОЛЯ ДУХОЎНА-ЭСТЭТЫЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРЫ ФАРМІРАВАННІ АСОБЫ СУЧАСНАГА ІНЖЫНЕРА

*Дзюрава І.І.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – магістр філ. навук*

Разглядаецца сістэма духоўна-эстэтычных каштоўнасцей у беларускай літаратуры на матэрыяле эсэістыкі У. Караткевіча і Л. Рублеўскай. Знаёмства з агульначалавечымі і агульнанацыянальнымі каштоўнасцямі праз творы беларускай літаратуры спрыяе гараманічнаму развіццю асобы будучага інжынера.

Курс «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», сярод іншага, мае на мэце далучыць студэнтаў да сістэмы нацыянальных каштоўнасцей. Паўнавартаснай рэалізацыі гэтага спрыяе заахвочванне чытання твораў беларускай літаратуры, хоць такая дзейнасць непасрэдна і не прадугледжана праграмай. Аднак на занятках час ад часу можа быць дарэчным згадаць штосьці, звязанае з літарутарай, творамі і аўтарамі. Каб паказаць духоўна-эстэтычныя каштоўнасці, закладзеныя ў беларускую літаратуру, намі для аналізу быў абраны жанр эсэ (паколькі з'яўляецца запатрабаваным сярод вучнёўскай моладзі: студэнты могуць не толькі чытаць такія творы, але і самі спрабаваць пісаць у гэтым жанры). Да разгляду ўзята эсэістыка такіх папулярных і чытаных аўтараў, як У. Караткевіч і Л. Рублеўская.

Эсэ, як сведчыць «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», – гэта «нарыс, які трактуе літаратурныя, філасофскія, сацыяльныя і інш. праблемы не ў сістэматычна-навуковым выглядзе, а ў вольнай форме» [1, т. 5, кн. 2, с. 478]. У «Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў» тлумачыцца, што «эсэ (ад франц. «essai» – спроба, нарыс, артыкул) – гэта від літаратуразнаўчага, крытычнага або філасофскага твора ў свабоднай форме" [2, с.134], адзначаецца, што жанр эсэ дае магчымасць аўтару выказваць і развіваць думкі, палажэнні без абгрунтаванняў і доказаў.

У жанры эсэ ў беларускай літаратуры працавалі такія пісьменнікі, як Якуб Колас, Уладзімір Караткевіч (амаль два тамы ў Зборы твораў), Міхась Стральцоў (эсэ «Загадка Багдановіча»), Алег Лойка (раманы-эсэ «Як агонь, як вада» і «Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае»), Янка Брыль (зб. «Пішу як жыву»), Янка Сіпакоў («Зялёны лісток на планеце Зямля»), Пятро Васючэнка («Беларус вачыма беларуса»). Метафізічная эсэістыка выразна праявілася ў творчасці А. Разанава.

У сучасным літаратуразнаўстве, як адзначае І. Бажок, – «мноства разнавіднасцей эсэ: літаратурна-крытычнае, белетрыстычнае, гістарычнае, філасофскае, рэлігійнае, псіхалагічнае, культуралагічнае, публіцыстычнае» [3, с. 14]. Сучасная эсэістыка прадстаўлена разнастайнымі відамі і формамі жанру: біяграфічныя эсэ Ф. Сіўко, лірычна-філасофскія эсэ А. Сямёнавай, літаратурна-крытычныя эсэ Л. Галубовіча, гістарычныя эсэ В. Казько, цыкл эсэ пра драматургаў Г. Марчука.

Імя Уладзіміра Караткевіча вядома не толькі кожнаму беларусу, але і кожнаму, хто цікавіцца выбітнай паэзіяй, інтэлектуальнай, гістарычнай прозай, драматургіяй, хто разумее, што геніяльная паэзія, проза, драматургія належыць аднаму пісьменніку, хто ведае, што гэты чалавек яшчэ і перакладчык, сцэнарыст, мастак, выдатны спявак і найлепшы на свеце сябра. Гэты светланосны чалавек вельмі любіў сваю краіну, сваю зямлю і тых людзей, што жылі, жывуць і будуць жыць на ёй. Ён справай і словам абараняў і працягвае абараняць усё беларускае, наскае, тым самым выхоўвае нас духоўна і эстэтычна. Ён знаёміць нас са здабыткамі сусветнай культуры, пры гэтым застаецца глыбока нацыянальным геніяльным творцам. Гэта ён паспяхова выпрабаваў сябе ў жанры гістарычнага дэтэктыву, гэта ён, чалавек энцыклапедычных ведаў, нястомнай самаадукацыі, багатай памяці, асмеліўся на такі жанр, як эсэ, дзе не толькі вольна раскрывае тэму, але і робіць надзвычай шырокія абагульненні, лагічныя і змястоўныя адступленні, дае розныя каментарыі, дзе многа экспрэсіі, дзе шчыра адкрывае сваю душу і душу народа, наш нацыянальны характар, дзе не проста дэманструе нам нашыя духоўныя і эстэтычныя каштоўнасці, а паказвае годны, прыгожы шлях да спасціжэння гэтых каштоўнасцей не толькі розумам, але і ўсім сэрцам. Насамрэч, як адзначае літаратуразнаўца А. Верабей, гэта гонар і сумленне не толькі беларускай літаратуры, а і ўсёй беларускай нацыі.

Людміла Рублеўская вядомая нам як паэтка, празаік, драматург, літаратурны крытык, журналіст, кіраўнік літаратурных суполак і школы маладога пісьменніка, з’яўляецца мадэратарам і арганізатарам шматлікіх літаратурных дыскусій. Пісьменніца заўсёды ў роздуме, у пошуку новых знаходак, новых жанравых форм, новых шляхоў прасоўвання беларускай літаратуры на еўрапейскую і сусветную прастору. Як адзначаюць даследчыкі, паэзіі Людмілы Рублеўскай уласцівы экзістэнцыйны роздум і напружаны псіхалагізм, рэфлексіўная медытатыўнасць і іранічны досціп, проза пісьменніцы адрозніваецца жанравым сінкрэтызмам. Гэта такія жанры і міжжанравыя ўтварэнні, як міфічныя / міфалагічныя навелы, «шляхецкія апавяданні», гістарычныя аповесці, пабудаваныя па прынцыпе «двусветавасці», гатычны раман, містычная аповесць, раман-інструкцыя, раман-лабірынт і інш. [4, с. 190].

А. Мельнікава гаворыць, што «Л. Рублеўская надзвычай натуральная ў сваёй творчасці. Яна не высільваецца, каб падацца разумнай, эрудзіраванай, прадэманстраваць свой інтэлект. І таму творы яе атрымліваюцца вельмі арганічнымі, цэласнымі, і гэтыя талент, эрудыцыя, інтэлект адчуваюцца» [5, с. 45].

«Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» фіксуе значэнне лексемы *каштоўнасць* як «важнасць, значнасць чаго-н.», у пераносным значэнні: «з’ява, прадмет, якія маюць вялікае грамадскае значэнне» [1, т. 2, с. 672]. Адно са значэнняў лексемы *духоўны* – «які мае адносіны да духу (дух – «псіхічныя здольнасці; свядомасць [1, т. 2, с. 211]); звязаны з унутраным, псіхічным жыццём чалавека» [1, т. 2, с. 212], а лексемы *эстэтычны*: «які мае адносіны да эстэтыкі», «звязаны з успрыманнем прыгожага ў жыцці і ў мастацтве», «выкліканы прыгожым у жыцці ці ў мастацтве» [1, т. 5, кн. 2, с. 477–478]. Першае значэнне перанакіроўваецца да лексемы *эстэтыка* – «філасофскае вучэнне аб мастацтве як асобным відзе грамадскай ідэалогіі, прысвечанае даследаванню ідэйнай сутнасці і форм прыгожага ў мастацкай творчасці, у прыродзе і ў жыцці»; «сістэма поглядаў на мастацтва ці які-н. яго від, якой хто-н. прытрымліваецца»; а таксама «прыгажосць, мастацкасць чаго-н.» [1, т. 5, кн. 2, с. 477].

Паспрабуем раскрыць сутнасць паняццяў *духоўныя* і *эстэтычныя каштоўнасці*.

Духоўныя каштоўнасці – гэта такія каштоўнасці, якія звязаны з вынікам і працэсам інтэлектуальнага і эмацыйна-вобразнага адлюстравання свету. У іх аснове – розум (разумныя думкі, разумныя выказванні, разумныя ўчынкі), свабода (свабода слова, свабода дзеянняў).

Духоўныя каштоўнасці ацэньваюць дзеянні ці ўяўныя з’явы, ухваляюць ці асуджаюць іх, патрабуюць здзяйснення ці перасцерагаюць ад гэтага, тлумачаць дабро і зло, праўду і ілжывасць, справядлівасць і несправядлівасць, сутнасць цудоўнага і пачварнага, маральнасці і амаральнасці, значыць, яны з’яўляюцца нарматыўнымі па сваім характары. Гэта правілы, эталоны, каноны, нормы, ідэалы, якія служаць пэўным алгарытмам культуры народа.

Духоўныя каштоўнасці самадастатковыя, доўгатэрміновыя, складаюць аснову культуры народа. Яны неабходныя для фарміравання і развіцця ўнутранага свету людзей, іх духоўнага ўдасканалення, менавіта яны вызначаюць сэнс дзейнасці чалавека, робяць быццё чалавека людскім, гарантуюць не проста яго існаванне, а існаванне духоўнае. Гэтыя ўніверсальныя каштоўнасці напаўняюць наша жыццё сэнсам.

Эстэтычныя каштоўнасці – гэта ідэальныя ўяўленні пра тое, што мае месца быць, уяўленні пра дасканаласць, мэтазгоднасць. Яны дапамагаюць рэальнае жыццё прывесці да згоды і ў адпаведнасць з ўяўленнямі пра дасканаласць.

Эстэтычныя каштоўнасці неаддзельныя ад эмацыйнай культуры чалавека, яго здольнасці да моцных перажыванняў, здольнасці ўспрымаць мноства адценняў настрою і пачуццяў, здольнасці імкнуцца да лепшага, самаразвівацца, самаўдасканальвацца.

Як адзначае Т. Шамякіна, «прыгажосць у пачатку ХХ стагоддзя разумелі як гармонію, прычым мелася на ўвазе, што эстэтычна прыгожае вядзе да паляпшэння жыцця, што гэта сімвал надзеі, абяцанне шчасця» [6, с. 145]. Узгадаем хаця б Максіма Багдановіча з яго прароцкімі словамі: «няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы», «добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком» і паэтычным крэда «Нашто каласы, калі няма васількоў» [7, с. 12]. Узгадаем і парадуемся, што ў беларускай літаратуры былі і ёсць яго паслядоўнікі, у тым ліку ў асобах У. Караткевіча і Л. Рублеўскай. Мы не прэтэндуем на паўнату, але паспрабуем вылучыць з эсэ творцаў комплекс духоўна-эстэтычных каштоўнасцей.

Духоўна-эстэтычнымі каштоўнасцямі ў эсэ У. Караткевіча [Караткевіч, У. Збор твораў. У 25 т. / Уладзімір Караткевіч – рэд. тома Віктар Іўчанкаў – Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. – Т. 12 : Публіцыстыка. Эсэ-нарысы. – 781 с.] і Л. Рублеўскай [Рублеўская, Л. І. Шыпшына для Пані : вершы і эсэ / Людміла Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 254 с.], на нашу думку, з’яўляюцца ўніверсальныя сімвалы культуры народа, такія, як камень, агонь, вада, снег, ралля (поле), храм.

***Камень*** *для Л. Рублеўскай і У. Караткевіча* – гэта сімвал народнай культуры, гісторыі народа, які дапамагае знайсці карані свайго роду, выхаваць у сабе гонар і павагу да сваёй краіны. *Для Л. Рублеўскай* камень – храм нашай гісторыі, у кожным каменьчыку – Беларусь. Для яе горад – гэта каменны свет. *Для У. Караткевіча* гарады – няпростая гісторыя Беларусі і бясконцая прыгажосць. Сам У. Караткевіч і людзі ў яго эсэ кланяліся каменю. Пісьменнік лічыць, што па адным каменьчыку можна аднавіць гісторыю.

*Для У. Караткевіча* ***агонь*** найперш купальскі. Пісьменнік хоча, каб тысячы купальскіх агнёў палалі над краінай, каб людзі нарэшце ўзгадалі купальскія песні, каб адрадзілі сваю прыгажосць ва ўсім і назаўсёды, каб памяталі, што наша краіна сонечная, цёплая, светлая, як і самі беларусы. *Л. Рублеўская* падказвае нам, што святло можна разгледзець у храме, у тэатры, у творах мастацтва, у каханні, нязменна памятаючы, што хапае ў нашай крыві і іншага агню – агню вогненных вёсак, агню-знічу і Вечнага агню.

*У. Караткевіч* лічыць, што Дняпро, Палессе, – гонар Беларусі. *Для Л. Рублеўскай* ***вада*** – энергія, дабраславенне і праклён. Пісьменніца спадзяецца на ваду жывую, як спадзяецца на яднанне свядомасці і

неўсвядомленага, што дазволіць чалавеку стацца асобай цэласнай. І *У. Караткевіч*, і *Л. Рублеўская* перасцерагаюць нас ад безадказнасці, бо яна не дазволіць нашчадкам быць шчаслівымі і гарманічнымі, не дазволіць расквітнець краіне на поўную моц. Выйсце з гэтага бачыць *У. Караткевіч*: трэба кожнаму з нас усвядоміць сябе кропляй «цэлага мора, вечнага мора, імя якому – народ», усвядоміць, што ад кожнага з нас залежыць будучыня ўсяго беларускага народа.

І ва *У. Караткевіча*, і ў *Л. Рублеўскай* ***снег*** – гэта прыгажосць, чысціня і ўтульнасць, як сапраўдныя, так і здрадлівыя, ён і сябра, і здраднік, ён і роўнядзь, і бездань, гэта і смерць, і сувязь з іншасветам.

Для *У. Караткевіча* найбольшае багацце – родная зямля. ***Поле*** – сімвал волі, міру і святла. Гэта песня. Вечна магутныя людзі. Гэта нязменныя высновы: «есці хлеб з поля, якое ты сам урабіў», не знішчаць прыгажосці, бо гэта «абкраданне душы народа». *Л. Рублеўская* выразна вызначае, што для беларуса поле – гвалтоўная смерць лесу, і ў гэтым трагічнасць вобраза-сімвала, якая ўзмацняецца палямі, засеянымі касцьмі, крывавымі разорамі. Пісьменніца акрэслівае дваістасць сімвалу поля. І *Л. Рублеўская*, і *У. Караткевіч* адзначаюць чалавечую бездапаможнасць і безабароннасць у полі. *Абое* пацвярджаюць эстэтычнае крэда М. Багдановіча «нашто каласы, калі няма васількоў», а самое поле Л. Рублеўская лічыць Багдановічавай антытэзай «каласка і васілька, матэрыяльнай карысці і чыстае красы». У эсэ Л. Рублеўскай поле – і спадзяванне на адраджэнне, і вяртанне да жыцця.

*У. Караткевіч* лічыць, што *Храм* нараджае пачуццё велічы і гонару, гэта душа нашых геніяльных продкаў, веліч нашай гісторыі, гэта творы мастацтва, наталенне душы прыгажосцю; заклікае захаваць гэты скарб і перадаць яго нашчадкам. *Л. Рублеўская* адзначае, што духоўная сутнасць Храма бессмяротная, і прапаноўвае ўбачыць у Храме святло падчас цемры; стварыць у душы Храм, чысты, светлы, непарушны, значыць, маральны, духоўны, эстэтычны; прапаноўвае рабіць крокі да Храма, добрыя справы, адкрываць сябе, спасцігаць таямніцы душы, рухацца наперад, станавіцца лепшым, прытрымлівацца годных, справядлівых, чалавечных, гуманных законаў, быць у суладдзі, у гармоніі са сваім унутраным «я». *У. Караткевіч* раіць быць уважлівымі да бацькоў, сяброў, разам тварыць добрыя справы на нашай зямлі. *Абое* яны просяць узводзіць Храмы на месцы зруйнаваных, клапоцiцца *Л. Рублеўская*, як мінчанка, пра Храм на беразе Свіслачы.

Комплекс духоўна-эстэтычных каштоўнасцей, якіх спрадвеку прытрымліваўся беларус, дазваляюць яму быць патрыётам, быць памяркоўным, міралюбівым, талерантным да людзей з адрозным мысленнем, светаўспрыманнем, стрыманым, трывалым і вынослівым, працавітым, заўважаць свае недахопы, шчыра выказваць свае эмоцыі, мець вялікую павагу да памерлых і да тых, хто будзе пасля нас.


***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я. Коласа ; пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча. – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – 5 т.*

*2. Ялынцава, І.У. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў для школьнікаў / І.У. Ялынцава. – Мінск : Беларус. асац. «Конкурс», 2012. – 144 с.*

*3. Бажок, І.А. Эсэ ў беларускай літаратуры : эвалюцыя, сучасныя тэндэнцыі развіцця : аўтарэф. дыс. ... канд. філ. навук : 10.01.01 / І.А. Бажок ; Нац. акад. нав. бел. – М., 2018. – 25 с.*

*4. Гоўзіч, І.М. Жанравая стратэгія творчасці Людмілы Рублеўскай / І.М. Гоўзіч, М.С. Рак // Труды БГТУ, 2016. – С. 190–194.*

*5. Мельнікава, А. Беларуская літаратура ХХ ст. у еўрапейскім кантэксце : курс лекцый. – Гомель : УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», 2007. – 126 с.*

*6. Шамякіна, Т.І. Духоўна-эстэтычныя пошукі пачатку ХХ стагоддзя і фарміраванне беларускай літаратурнай класікі / Т.І. Шамякіна // Міфалогія – фальклор – літаратура: праблемы паэтыкі : зб. нав. пр. / БДУ, філ. фак., каф. тэорыі літ-ры, каф. бел. літ-ры і культ ; пад агул. рэд. В.П. Рагойшы. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2007. – Вып. 5. – С. 139–149.*

*7. Багдановіч, М. Шыпшына : вершы, апавяданні, нарысы, крытыка, публіцыстыка : для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / М. Багдановіч ; укладальнік С. Панізнік. – Мінск : Юнацтва, 1991. – 238 с.*